# Навукова-практычная канферэнцыя "Гісторыка-культурная спадчына Слонімшчыны: погляд у міну

Аўтар: Администратор
13.08.2022 15:22 -





12 жніўня ў Слонімскім раённым краязнаўчым музеі адбылася навукова-практычная канферэнцыя "Гісторыка-культурная спадчына Слонімшчыны: погляд у мінулае", арганізаваная сумесна з Інстытутам гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, пры падтрымцы Слонімскага райвыканкама. Канферэнцыя прымеркавана да Года гістарычнай памяці і да 770-годдзя Слоніма. Пленарнае пасяджэнне адкрыў дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім Леанідавіч Лакіза. З рук высокага госця слонімскія краязнаўцы і педагогі-гісторыкі атрымалі "Падзякі інстытута гісторыі НАН Беларусі" за асаблівы ўклад у вывучэнне і папулярызацыю рэгіянальнай гісторыі Слонімшчыны. У сваім дакладзе Вадзім Леанідавіч падрабязна спыніўся на ўкладзе вучоных Нацыянальнай акадэміі навук у вывучэнне, зберажэнне і папулярызацыю гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны Беларусі і непасрэдна Слонімскага раёна. Былі заслуханы цікавыя навуковыя даклады, якія датычацца невядомых старонак

гісторыі нашага краю.